***В.І. Еўманькоў*** (Магілёў)

# ВАЙНА ЯК ЧАКАННЕ ЦУДА: "ZDOBYCIE WŁADZY" ЧЭСЛАВА МІЛАША

У рамане Ч. Мілаша "Zdobycie władzy" вялікае значэнне мае праблема адпаведнасці мэтаў вайны нормам хрысціянскай маралі. У яе кантэксце ключавым з'яўляецца вобраз "гераічнага езуіта" айца Ігнацы, які раптам з'яўляецца ў Варшаўскім гета і змяняе ўсё – "zginęło napięcie samotnej łodzi podwodnej, na chwilę świat odzyskiwał swój ład". Езуіт спыняе духоўны разлад сярод паўстанцаў, тлумачыць, "że była to po prostu wojna, linia frontu", а гэта значыць – не трэба задумвацца над тым, што і без таго цалкам зразумела і натуральна. Напрыклад, ці варта страляць у параненага немца, ці грэх



Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

гэта забіваць палоннага. Парадокс у тым, што паводле прафесіі айцец быў матэматыкам і, больш таго, "autorem traktatu, w którym przy pomocy logiki matematycznej dowodził istnienia Boga" [1, s. 44].

У гета ён чытаў лекцыі, у якіх з метафізічнага пункту погляду тлумачыў падзеі другой сусветнай вайны. Абвінавачваў усіх – капіталістаў, камуністаў, фашыстаў, масонаў, дэмакратаў, "do kolekcji brakowało tylko Żydów, którzy o dwa kilometry <...> byli ładowani w wagony wiozące ich do komór gazowych" [1, s. 47]. Езуіт-матэматык не верыў у Бога, а, дзякуючы матэматычным дыфініцыям, ведаў, што Ён ёсць. І гэта веданне ўзносіла яго над людзьмі, пераўтварала ў архіанёла Міхаіла, якому дадзены ў рукі меч Боскай помсты.

У імя Бога айцец Ігнацы не саромеецца заклікаць "nie cofać się przed radykalnymi środkami nie oszczędzać krwi". Няўжо такая пазіцыя ўсяго Касцёла, разважае Ч. Мілаш, няўжо гэткай жа самай логікай кіраваўся і Св. Аўгусцін, які ў свой час таксама даказаў існаванне Бога? Калі так, чым адрозніваюцца яны, паўстанцы варшаўскага гета, ад эсэсаўцаў? І першыя, і другія – каталікі, якія забіваюць у імя Бога.

Аднак большасць паўстанцаў нават і не патрабавала апраўдання сваіх учынкаў, варшавяне задавольваліся тым, што "Бог ведае пра іх і абароніць ад зла". Розум людзей паспалітых не сягае ў такія інтэлектуальныя глыбіні, у якіх губляецца мяжа паміж Дабром і Злом, ім дастаткова ведаць тое, «że wszystko czym był i czym był świat zawierało się skrócone, równoczesne, w słowie "być" i w słowie "nie być"» [1, s. 45]. Падчас вайны іншыя катэгорыі не працуюць, а бясконцае ваганне на тэму "забі – не забі" павадуе смерць.

Вобраз езуіта досыць важны ў рамане. Ён апраўдвае акт паўстання, называе яго Боскім, і ў гэтым кантэксце айцец Ігнацы неабходны Ч. Мілашу як каталізатар легітымнай, нібыта справядлівай вайны, як частка таго традыцыйнага механізму, які прыводзіў у рух усе папярэднія "польскія" паўстанні.

Ч. Мілашу важна працягнуць паралель паміж папярэднімі паўстаннямі і паўстаннем 1945 г. Аднак, калі ў 1831 і ў 1864 гг. гаварылася ўсяго аб нацыянальным разняволенні, то ў 1945 г. паўстала куды больш глабальная праблема, якая датычылася не толькі палякаў. Варшаўскае паўстанне напрыканцы другой сусветнай вайны – гэта пратэст старой патрыярхальнай каталіцкай Еўропы супраць таталітарных рэжымаў, якія апанавалі захад і ўсход кантынента. У духоўным плане – паўстанне хрысціян супраць сучасных варвараў, язычнікаў (фашысты і бальшавікі). І ў гэтым выпадку, якім павінна быць гэта паўстанне? Ці не трэба ўносіць пэўныя карэктывы ў традыцыю нацыянальных польскіх паўстанняў? Вось самае галоўнае пытанне, якое турбуе Ч. Мілаша.

Паводле айца Ігнацы, вайна "jest tylko obowiązkiem wobec Boga i ojczyzny". І гэта стары погляд на паўстанне, які пісьменнік не падзяляе, бо, на



Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

яго думку, вайна “dla niektórych jest formą samobójstwa”. Робячы гэту выснову, Ч. Мілаш згадвае капітана Асмана, смерць якога выпадковая. Жаўнер загінуў ад выпадковай кулі. У нагруднай кішэні капітана знайшлі фотаздымак: “Młoda kobieta, gładko zaczesane włosy, głowa schylona ku małej dziewczynce, którą trzyma na ręku” [1, s. 46]. Выявілася, што і ён – начны снайпер і забойца дзесяткаў немцаў – “miał rodzine”, а гэта значыць, быў чалавекам, меў звычайныя прагненні, чаканні і надзеі.

Падчас вайны такога чалавека ўжо не існавала, замест яго нарадзіўся мсціўца Асман, безаблічны шэры нумар у бясконцым шэрагу іншых. І ў гэтым сэнсе вайна для Асмана – самазабойства. Гэткае ж самазабойства яна і для Фокі, Бертранда, Магды, а таксама і іншых персанажаў рамана. Тыя, хто змагаюцца са Злом, непазбежна забруджваюцца ім, а нават і становяцца на яго бок. І перамагчы ў гэтым выпадку зло можа толькі цуд, Боскі імпульс, які пераадольвае цунамі.

І ў гэтым асаблівасць адлюстравання вайны, якая для Ч. Мілаша – бясконцае чаканне цуда. Надзея на цуд як на Боскае выратаванне кіруе паўстанцамі, якія сабраліся ў касцёле дзеля адчытання малітваў. Вядомыя з дзяцінства словы даюць надзею. Аднак таго самага цуда, які спыніць цунамі, чакаюць не толькі палякі, але і немцы. Бо ўласнай волі мала, каб наталіць прагу крыві.

**Літаратура**

1. **Miłosz, Cz.** Zdobycie władzy / Cz. Miłosz. – Poryż: Instytut literacki, 1989. – 159 s.

Могилевский государственный университет имени А. А. Кулешова